УДК 811.161.3 В. М. Сімановіч, асп. (БДПУ імя Максіма Танка, г. Мінск)

# ПРЫНАЗОЎНІКАВЫЯ СУБСТАНТЫВЫ Ў СІСТЭМЕ БЕЛАРУСКІХ ПРЭСОНІМАЎ

Назвы перыядычных выданняў (прэсонімы) для беларускай лінгвістыкі з'яўляюцца актуальным аб'ектам даследавання. Іх моўнае вывучэнне прадугледжвае структурны, граматычны, семантычны і функцыянальны аспекты апісання.

Гэтая работа прысвечана вывучэнню асаблівасцей субстантыўных канструкцый з прыназоўнікамі ў сістэме беларускіх прэсонімаў і ў розным аб'ёме закранае названыя вышэй аспекты.

Група прэсонімаў, у склад якіх, акрамя асноўных кампанентаў, уваходзяць прыназоўнікі, з'яўляецца адносна нешматлікай (каля 10 % ад агульнай колькасці назваў перыядычных выданняў). Аднак такія найменні па сваіх граматычна-семантычных характарыстыках істотна адрозніваюцца ад безпрыназоўнікавых: дадатковыя структурныя кампаненты канкрэтызуюць значэнне асноўных кампанентаў і могуць выражаць разнастайныя адносіны паміж імі.

Асноўная частка названай групы прэсонімаў прадстаўлена двухкампанентнымі найменнямі з прыназоўнікам у прэ- або інтэрпазіцыі і рэалізуецца намінацыйнымі мадэлямі **"pr+Sub+Sub"**, **"Sub+pr+Sub"**: *За ўладанне тэхнікай*, *За развіццё ільну*, *На варце Кастрычніка*, *Па запаветах Леніна*, *Беларусы ў свеце*, *Змена ў баю*, *Пад сцягам Сталіна*, *Вястун над Убарцю* і інш. Адзінкавыя назвы ўтвораны па мадэлі **"pr+Sub+Con+Sub"**, якая адрозніваецца ад прыведзенай вышэй наяўнасцю злучніка *і*: *За тэмпы і якасць*, *За шасэ і матор*. Значная колькасць перыядычных выданняў належыць да монакампанентнай мадэлі "**pr+Sub"**: *За абарону*, *За праўду*, *На ўздыме*, *Да працы* і інш. Да групы полікампанентных найменняў належаць прэсонімы, утвораныя па мадэлі **"pr+Sub+Sub+con+Sub"**: *За аздараўленне працы і побыту*, *Пад сцягам Леніна і Лібнехта.*

Прыназоўнікі, якія ўваходзяць у структуру прэсонімаў, выконваюць розныя функцыі:

1) прыназоўнік **да** ў структуры прэсонімаў паказвае на тое, да чаго заклікаюць [2, с. 152]: *Да злучэння*, *Да працы*, або "на з'яву, падзею, дасягненне якіх складае змест дзеяння, што выступаюць у якасці мэты дзеяння" [2, с. 152]: *Шлях да камунізма*;

2) прыназоўнік **з** паказвае "на прадмет, прастору і г. д., знутры або з межаў якіх накіраваны рух, дзеянне" [2, с. 136]: *Голас з Ліды*;

3) прыназоўнік **за** выкарыстоўваецца пры ўказанні на чалавека, якую-небудзь справу і г. д., з мэтай забеспячэння (захавання) дабрабыту якіх ажыццяўляецца дзеянне: *За калектывізацыю*, *За*

*праўду*, *За Радзіму*, *За ўладанне тэхнікай*, *За развіццё ільну*, *За тэмпы і якасць*, *За аздараўленне працы і побыту* і інш.;

4) прыназоўнік **на** ў назвах перыядычных выданняў паказвае: а) на палажэнне, стан, у якім што-небудзь знаходзіцца ці прыводзіцца [2, с. 196]: *На ўздыме*, *На варце*, *На чыстцы ЦРК*, *На варце Кастрычніка* і інш.; б) на прадмет, які з'яўляецца аб'ектам накіраванага на яго дзеяння [2, с. 200]: *Камсамолец на самалёт*; в) "на месца, мясцовасць, у межах якіх што-небудзь адбываецца, знаходзіцца" [2, с. 196]: *На рубяжы*, *На чужыне*, *Ударнік на будоўлі*, *Праўда на рубяжы*; г) "на дзейнасць, з'яву, якія выступаюць у якасці мэты дзеяння" [2, с. 199]: *На абарону СССР*, *На штурм бездарожжа*; д) на чалавека, прадмет, на якія накіравана дзеянне [2, с. 200]: *На акупанта!*;

5) прыназоўнік **над** паказвае на чалавека, прадмет, месца і г. д., вышэй за якія знаходзіцца пэўны прыродны аб'ект [2,с. 202]: *Вястун над Убарцю*, *Зара над Сожам*, *Зара над Друццю* і інш.;

6) прыназоўнік **па** выкарыстоўваецца пры ўказанні на аб'ект, асобу, якія вызначаюць характар пэўнага дзеяння або з'явы: *Па запаветах Леніна*;

7) прыназоўнік **пад** у складзе прэсонімаў выкарыстоўваецца ў двух значэннях і паказвае: а) на асобу, падзею, ідэю і г. д., якія вызначаюць характар, змест дзеяння, працэсу [2, с. 266]: *Пад сцягам Сталіна*, *Пад сцягам Леніна і Лібнехта*; б) "на прадмет, з'яву і г. д. (кампанент знешняй сітуацыі), уздзеянню якіх… хто-што-небудзь падвяргаецца" [2, с. 264]: *Пад агонь самакрытыкі*;

8) прыназоўнік **у** ў складзе прэсонімаў паказвае: а) на прастору, межы, унутры якіх хто- або што-небудзь знаходзіцца, нешта адбываецца [2, с. 41]: *Беларусы ў свеце*, *Змена ў баю*; б) на сукупнасць людзей, на якіх накіравана дзеянне [2, с. 42]: *Друк у масы*, *Тэхніка ў масы*; в) "на мэту, дзеля якой ажыццяўляецца дзеянне" [2, с. 43]: *У дапамогу настаўніку*, *У дапамогу партвучобе* і інш.

Такім чынам, аналіз фактычнага матэрыялу паказаў, што за кошт увядзення прыназоўнікаў у структуру назваў перыядычных выданняў выпрацоўваюцца спецыфічныя намінацыйныя мадэлі, дастаткова шырока прадстаўленыя ў сістэме беларускіх прэсонімаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Объяснительный словарь русского языка / Государственный институт русского языка им. А. С. Пушкина. – 2-е изд., испр. – Москва: Астрель, 2003. – 421 с.